чэрвень 2021

**Дыктант**
**для правядзення ўступных іспытаў**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**
**пры прыёме асоб у X клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі**
**ў дзяржаўнай установе адукацыі**
**«Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**

## Хараство бабінага лета

На працягу двух тыдняў ідзе дождж. Цярушыць і цярушыць, быццам праз сіта. А часам падзьме халодны вецер. Здаецца, яшчэ тыдзень-другі - і на змену дажджу пасыплецца снег, ляжа на зямлю мяккім пухам.

Зусім нечакана дождж перастаў ісці. Усё навокал ажыло, павесялела. Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя лёгкай задуменнасці і хараства.

Вяртанне цяпла ў кастрычніку бывае амаль кожны год і доўжыцца некалькі дзён, а то і тыдняў. У народзе пра гэтую пару восені з замілаваннем кажуць, што настала бабіна лета. Адчуўшы цяпло, ажываюць насякомыя: зноў з'яўуляюцца стракатыя матылькі, мітусяцца хуткакрылыя стракозы. Са сваіх хадоу-лабірынтаў вылазяць пагрэцца на сонейку лясныя мурашкі. Часам нават прагудзе над адзінокай кветкай калматы чмель. Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў. Хто назапашвае на зіму кармы, хто спяшаецца цёплае жыллё ўладкаваць, хто проста набіраецца сілы. Кароткія яны, залатыя дзянькі бабінага лета. (139 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*